# Берагіня. Прыма. Прыгажуня


Фрагмент экспазіцыі "Абярэжнае кола"

**Абуджэнне прыроды і жаночая краса — традыцыйныя лейтматывы сакавіцкіх арт-праектаў. Гэтымі днямі на розных сталічных пляцоўках праходзяць выставы, што раскрываюць дасягненні нашых таленавітых суайчынніц, апяваюць іх духоўны свет і вонкавае хараство. "К" прапануе агляд найбольш цікавых экспазіцый.**

## ЛЕГЕНДЫ СЦЭНЫ

Пачатак вясны даў нагоду супрацоўнікам Музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры ўспомніць найбольш яркія жаночыя вобразы на беларускай сцэне. Тэматычная экспазіцыя прысвечана актрысам, якія ў розныя часы працавалі ў нашых тэатрах і прычыніліся да пастановак, што трапілі ў залаты фонд айчыннага мастацтва. Праз асабістыя рэчы артыстак і сцэнічныя касцюмы з фондаў Нацыянальнага гістарычнага музея гледачы могуць пазнаёміцца з самымі значнымі спектаклямі ў лёсе гераінь.

Безумоўна, цэлую эпоху ў гісторыі культуры ўвасабляе бліскучая спявачка Ларыса Александроўская. На выставе паказаны фотаздымак са спектакля "Фауст" 1928 года — дыпломнай оперы выхаванцаў Беларускага музычнага тэхнікума, у якой будучая народная артыстка выконвала партыю Маргарыты. Шэраг фотапартрэтаў Ларысы Александроўскай у розных ролях нагадвае пра шматгранны талент і багаты рэпертуар славутай салісткі. Перад наведвальнікамі музея яна паўстае Марысяй з оперы "Міхась Падгорны", Графіняй з "Пікавай дамы" і ў мностве іншых запамінальных вобразаў. Сведчаннем вытанчанага густу артысткі выступае невялікая калекцыя караляў ды сукенка, па-майстэрску расшытая пацеркамі.


Фрагменты выставы "Фарбы вясны — вобраз цудоўнай"

Маштабную галерэю жаночых вобразаў на купалаўскай сцэне стварыла Стэфанія Станюта. Абаяльная, інтэлігентная, вытанчаная — такой яе запомнілі розныя пакаленні тэатралаў. Прыналежнасць мемарыяльных рэчаў народнай артысткі зразумелая музейнаму гледачу нават без этыкетак: сціплыя і адначасова элегантныя аксесуары нібы сімвалізуюць характар уладальніцы.

Таксама ў экспазіцыі дэманструюцца фотаздымкі, сцэнічныя касцюмы і аксесуары Святланы Акружнай, Галіны Арловай, Наталлі Гайды, Аляксандры Клімавай і Тамары Ніжнікавай. Узгадаць увасобленыя імі вобразы ракавых прыгажунь і рамантычных асоб можна да 30 красавіка.

## ФАРБЫ ПЯШЧОТЫ

Усе колеры прыгожай litary пары ўвабрала ў сябе "Палітра вясны". Так называецца выстава ў галерэі "Ракурс" Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Паказаныя работы апяваюць цудоўны час абуджэння прыроды пасля зімовага сну.

Кветкавыя кампазіцыі, абстракцыі, жаночыя вобразы — жывапісныя і графічныя творы розных жанраў увасабляюць пяшчоту, чароўнасць першых цёплых дзён, энергію сонечнага святла. Разнастайныя адценні вясновага цвіцення адлюстравалі Віктар Данілаў, Лізавета Пастушэнка, Марына Эрэнбург, Сафія Піскун і іншыя аўтары, сярод якіх чальцы Беларускага саюза мастакоў і Еўразійскай мастацкай садружнасці, лаўрэаты конкурсаў. Экспазіцыя чакае наведвальнікаў да 7 красавіка.

## ЗАЎСЁДЫ ШЧЫРЫЯ

У мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" адкрылася выстава дзіцячай творчасці "Фарбы вясны — вобраз цудоўнай". Яна змяшчае работы навучэнцаў дзіцячых школ мастацтваў Мінска, выхаванцаў устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, артстудыі "Флорыя". Арганізатарамі выставы-конкурсу выступілі грамадская арганізацыя "Беларускі саюз жанчын", Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў і мастацкая галерэя "Універсітэт культуры". Усяго было даслана каля 400 заявак з усіх рэгіёнаў Беларусі.

— Для нас падтрымка творчай моладзі з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці, — адзначае дырэктар галерэі "Універсітэт культуры" Марына Татарэвіч. — Штогод мы арганізуем конкурсы, ладзім выставы маладых мастакоў. Для нашай краіны сёння важна выяўляць таленавітых асоб, падтрымліваць іх. Што тычыцца юных аўтараў, то для іх удзел у падобных выставах-конкурсах — гэта магчымасць прадэманстраваць свае здольнасці, атрымаць ацэнку ад прафесіяналаў і пашырыць кругагляд.

Падтрымка і развіццё юных талентаў — гэта не проста ўвага да маладога пакалення, а сур'ёзны ўклад у будучыню краіны. Тым больш што выстава мае на мэце папулярызацыю ролі жанчыны ў жыцці грамадства і трансляцыю традыцыйных сямейных каштоўнасцей.

— Калі мы з дзяцінства далучаем чалавека да мастацтва, то гадуем асобу на глебе сапраўдных каштоўнасцей, — кажа рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Наталля Карчэўская. — Я лічу вельмі важным у раннім узросце заўважыць талент, патрымаць і накіраваць яго. Нават калі чалавек не абярэ мастацтва сферай сваёй прафесійнай дзейнасці, у любым выпадку гэта пакіне добры след у яго душы. Нам вельмі хацелася прадэманстраваць тое, як нашы дзеці бачаць беларускую жанчыну: сваю маму, сястру, бабулю. На малюнках яна пяшчотная, кранальная, часам, з нашага дарослага пункту гледжання, у нечым камічная, але ва ўспрыманні дзіцяці заўсёды сапраўдная і шчырая.

Работы юных аўтараў адлюстроўваюць зборны вобраз беларускай жанчыны: пяшчотнай і мэтанакіраванай, захавальніцы сямейнага ачага і грамадскага лідара. Наведаць выставу "Фарбы вясны — вобраз цудоўнай" можна да 23 сакавіка.

Паралельна ў галерэі разгарнулася часовая экспазіцыя "На крылах вясны", што знаёміць з творчасцю выкладчыкаў і студэнтаў кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Тэматычнай асновай сталі вясновыя народныя святы. Даўнія звычаі аўтары пераасэнсавалі ў кантэксце колеру і формы ў розных відах і тэхніках. Такім чынам паўсталі актуальныя сучасныя творы, цесна знітаваныя з багатай спадчынай народа.

## НАШЫ ТРАДЫЦЫІ

Паказаць жаночы погляд на свет праз мастацкія вобразы — так вызначана мэта выставачнага праекта "Абярэжнае кола". Яго арганізавалі Маскоўскае аддзяленне Саюза мастакоў Расіі і Магілёўскі абласны мастацкі музей імя П.В. Масленікава. "Гэта экспазіцыя пра жаночую энергію і жаночую місію. У славянскай традыцыі кожная жанчына з'яўляецца Берагіняй, якая нябачным абярэжным колам ахоўвае ўсё каштоўнае, што патрабуе абароны і развіцця", — так тлумачаць назву праекта яго кіраўніца Яна Поклад.

Увазе магілёўскіх гледачоў прапанавалі творы сучаснага мастацтва, прысвечаныя беларускім і расійскім жанчынам, іх укладу ў духоўнасць і культуру. Прыкладам, рэстаўратар і дызайнер Вольга Арлова-Халадкова прэзентавала стылізаваныя традыцыйныя касцюмы, адмыслова для выставы стварыла і беларускі народны строй. Усяго ж у экспазіцыі дэманструюцца каля 80 работ у розных відах і жанрах: жывапісныя партрэты, нацюрморты і сюжэтныя кампазіцыі, скульптуры, узоры ткацтва. Гэта работы народнага мастака Расійскай Федэрацыі Элеаноры Жаронавай, віцэ-прэзідэнта Расійскай акадэміі мастацтваў Таццяны Качамасавай і іншых аўтарытэтных творцаў.

Асветніцкая ініцыятыва служыць прасоўванню традыцыйных славянскіх каштоўнасцей на прасторах Саюзнай дзяржавы. Раней выставачны праект прэзентавалі ў Маскве. Мяркуецца, што надалей перасоўная экспазіцыя наведае Віцебск, Гомель, Полацк, Бабруйск, іншыя гарады Беларусі.

**Даніїл ШЭЙКА, Яўгенія ГАБЕЦ**
Фота Яўгеніі ГАБЕЦ